САВЕТ МІНІСТРАЎ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

СОВЕТ МИНИСТРОВ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

ПАСТАНОВА

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

1 верасня 2011 г. № 1166

г. Мінск

г. Минск

Аб узнагароджанні Ганаровай граматай
Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Узнагародзіць Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь:

Сычова Аляксандра Мікалаевіча, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Аўстрыйскай Рэспубліцы, Пастаяннага прадстаўніка Рэспублікі Беларусь пры міжнародных арганізацыях у Вене па сумяшчальніцтву, за шматгадовую бездакорную працу ў галіне знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, плённую дзейнасць па развіццю міжнароднага супрацоўніцтва і ўмацаванню аўтарытэту дзяржавы на міжнароднай арэне;

наступных работнікаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта:

Гаеўскую Таццяну Васільеўну, дырэктара ўстановы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта "Навукова-даследчы інстытут фізіка-хімічных праблем", за шматгадовую плённую працу, значны асабісты ўклад у арганізацыю даследаванняў у галіне хімічных навук;

Грамака Валерыя Іванавіча, загадчыка кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў і сістэмнага аналізу, за шматгадовую навукова-педагагічную дзейнасць, значны асабісты ўклад у падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў;

Карзуна Георгія Міхайлавіча, дырэктара навукова-вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства "Унікаштмет БДУ", за шматгадовую плённую навуковую дзейнасць, значны асабісты ўклад у стварэнне высокаэфектыўных тэхналогій перапрацоўкі каштоўных металаў;

Кучынскага Пятра Васільевіча, дырэктара навукова-даследчай установы "Інстытут прыкладных фізічных праблем імя А.Н.Сеўчанкі" Беларускага

Белорусский государственный университет
Управление организационной работы и документационного обеспечения
«05» 09 2011 г.
№ 2785

дзяржаўнага ўніверсітэта, за шматгадовую плённую працу, значны асабісты ўклад у арганізацыю даследаванняў у галіне фізічных навук;

Лямешчанку Пятра Сяргеевіча, загадчыка кафедры тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі, за шматгадовую навукова-педагагічную дзейнасць, значны асабісты ўклад у падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў;

Максіменку Сяргея Афанасьевіча, загадчыка лабараторыі электрадынамікі неаднародных асяроддзяў навукова-даследчай установы "Інстытут ядзерных праблем" Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, за шматгадовую плённую працу, значны асабісты ўклад у арганізацыю даследаванняў у галіне фізічных навук;

Рагавіцкага Уладзіміра Васільевіча, прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце, за шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм, значны асабісты ўклад у развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы ўніверсітэта;

Шадыру Алега Іосіфавіча, загадчыка кафедры радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій, за значныя дасягненні ў галіне навуковых даследаванняў і асабісты ўклад у практычную рэалізацыю іх вынікаў у народнай гаспадарцы Рэспублікі Беларусь.

Прэм'ер-міністр
Рэспублікі Беларусь — М.Мяснікові́ч

АПАРАТ САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
ДЛЯ ДАКУМЕНТАЎ
3

09

15 верасня 2011 г. № 1236

**Аб узнагароджанні Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь**

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Узнагародзіць Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь за:

шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць, значны асабісты ўклад у развіццё айчыннай эканамічнай навукі Кавалёва Міхаіла Міхайлавіча, дэкана эканамічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта;